пераканацца ў адваротным: рэдакцыя актыўна шукае актыўныя фарматы ўзаемадзеяння з медыяспажыўцом, вынаходзіць новыя формы стварэння кантэнту, укараняе новыя практыкі яго распаўсюджвання. Пры гэтым заўважаецца характэрная і для рэспубліканскіх СМІ акалічнасць: інфармацыйнае агенцтва мае сярэднюю наведвальнасць відэапартала і папяровы варыянт пераважае над наведваннем відэахостынгу.

Такім чынам, YouTube як адзін з перспектыўных каналаў у інтэрнэт-асяродку застаецца максімальна запатрабаваным і набывае новыя камунікацыйныя прыярытэты, што вымушае бачыць у ім з цягам часу не толькі рэсурс відэасэрвісу, а і перарастанне яго ў тэхналогію «вэбвізара», метрыкі якога дадуць магчымасць аналізаваць паводзіны карыстальнікаў на старонках сайта, напрыклад, фіксаваць дзеянні карыстальнікаў у выглядзе кароткага апісання ці відэафайла, што стварае перавагі для маркетолагаў у пошуку аптымальных шляхоў арганізацыі дзейнасці СМІ.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Михайлова В. М., Фицурина М. С., Петровский Е. Н.* Youtube как канал коммуникации. Краснодар : Кубанский государственный технологический университет, 2018. С. 126–130.
2. *Ивченков В. И.* Журналистика и дискурсный анализ СМИ как сферы научного познания // Журналістыка–2013 : стан, праблемы і перспектывы: матэрыялы XV Міжнар. навук.-практ. канф., 5–6 снежня 2013 г., Мінск / рэдкал. : С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. Вып. 15. Мінск : БДУ, 2013. С. 201–205.
3. МЛЫН.BY [Электронны рэсурс]. URL: https://www.youtube.com/channel/UCFZiGm2mwRgFVdrlO1T-3-g/playlists (дата звароту: 17.05.2021).


## «ЗЫСЛАЎСКІ» ПЕРЫЯД У ВЫДАВЕЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ГАЗЕТ «ЗВЯЗДА», «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА» І «КЛІЧ РАДЗІМЫ»


***В. І. Канюта***

*Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,*
*вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*veronika_kanyuta@mail.ru*



Вызначаецца роля падпольнага друку ў перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі Беларусі. Даследуецца гісторыя стварэння аб’яднанай рэдакцыі дзвюх рэспубліканскіх газет – «Звязды» і «Чырвонай змены» – на тэрыторы

вострава Зыслаў Любанскага раёна Мінскай вобласці. Раскрываюцца дэталі выхаду любанскай раённай газеты «Кліч Радзімы» ў партызанскай зоне.

***Ключавыя словы:*** журналістыка; падпольны друк; Другая сусветная вайна; востраў Зыслаў; газета «Звязда»; газета «Чырвоная змена»; газета «Кліч Радзімы».

## «ZYSLAVSKY» PERIOD IN PUBLISHING ACTIVITIES OF THE NEWSPAPERS «ZVYAZDA», «CHYRVONAYA ZMENA» AND «KLICH RADZIMY»

***V. I. Kanyuta***

*Publishing institution «Publishing house «Zvyazda»,*
*10-a, B. Khmelnitskogo Str., 220013, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: V. I. Kanyuta (veronika_kanyuta@mail.ru)*

The role of underground press during the period of Nazi occupation of Belarus is determined. The history of the creation of the associated editorial office of the two republican newspapers – «Zvyazda» and «Chyrvonaya Zmena» – on the territory of the island Zyslov, Lyuban district, Minsk region is investigated. The details of publishing Lyuban regional newspaper «Klych Radzimy» in the partisan zone are considered.

***Key words:*** journalism; underground press; World War II; island Zyslov; newspaper «Zvyazda»; newspaper «Chyrvonaya Zmena»; newspaper «Klych Radzimy».

Шматлікія спробы фальсіфікацый гістарычных фактаў, звязаных з падзеямі Другой сусветнай вайны, якія перыядычна транслююцца на розных інфармацыйных пляцоўках, вымушаюць навукоўцаў і журналістаў рэгулярна звяртацца да мінулага, адстойваць гістарычную праўду. У прыватнасці, цяжка пераацаніць ролю сродкаў масавай інфармацыі, якія нелегальна, пад пагрозай знішчэння іх стваральнікаў і распаўсюджвальнікаў, выходзілі на акупаванай тэрыторыі. Па словах даследчыка нацыянальнага друку Т. Падаляк, тое, што «ў перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі 1941–1944 гг. на тэрыторыі Беларусі падпольна выдавалася больш за 160 газет – гэта адметны факт не толькі для беларускай, але і для сусветнай журналістыкі» [1, с. 113]. Багаты архіў падпольнай перыёдыкі, які захоўваецца ў фондах і экспазіцыях адпаведных культуралагічных устаноў Беларусі, сведчыць: нават невялікая публікацыя дзейнічала на ворага не горш за зброю, выхад жа

паўнавартаснага выпуску газеты ці часопіса прыраўноўваўся да выбуху бомбы. Ваеннымі карэспандэнтамі зафіксаваны канкрэтныя выпадкі, калі пасля прачытання перыёдыкі людзі аб'ядноўваліся ў невялікія групы, далучаліся да падпольнага і партызанскага руху. За выкрыццё антыфашысцкіх рэдакцый акупанты абяцалі шматлікія прывілеі.

Адным з эпіцэнтраў падпольнага друку ў гады Вялікай Айчыннай вайны на Міншчыне з'яўляўся Любанскі раён. На востраве Зыслаў (урочышча на Загальскіх балотах Любанскага раёна. – *В. К.*), дзе размяшчаліся Мінскія падпольныя абкамы КП(б)Б і ЛКСМБ, Любанскі падпольны РК КП(б)Б, штабы некаторых партызанскіх злучэнняў, а таксама партызанскі аэрадром, у студзені 1943 года аднавілі выпуск адразу дзве рэспубліканскія газеты – «Звязда» і «Чырвоная змена» («ЧЗ»).

Пасля масавых арыштаў журналістаў-падпольшчыкаў у акупаваным Мінску (з мая па верасень 1942 г. выйшлі чатыры нумары «Звязды», пяты быў падрыхтаваны) далейшая выдавецкая дзейнасць у сталіцы БССР стала немагчымай. У сувязі з акупацыяй Гомеля змяніць месца дыслакацыі вымушана была і рэдакцыя падпольнай «Чырвонай змены», якая пасля спынення выхаду ў Мінску выдавалася на гомельскай фабрыцы «Палесдрук» (тут выйшлі 24 выпускі). «Апошні нумар «Чырвонай змены» друкаваўся ў кастрычніку 1941 года ў Тульскай вобласці, у вёсцы Жаваранкі. Нумары, упакаваныя ў цюкі, даставілі на аэрадром. Першы сакратар ЦК ЛКСМБ Міхаіл Зімянін, калі адпраўляў газеты, з сумам пажартаваў: «Ну вось, паляцеў наш першы жаўрук» (Звязда, 2021, 21 крас.). Аднак замаўчалі дзве газеты ненадоўга.

Выпуск падпольных выданняў аднавіўся на востраве Зыслаў. Першы нумар «Звязды» ў партызанскай зоне ўбачыў свет 27 студзеня 1943 года, 31 студзеня 1943 года выйшла «Чырвоная змена». Рэдактарам аб'яднанай рэдакцыі дзвюх газет зацвердзілі Міхаіла Парфёнавіча Барашкава (рэдагаваў «ЧЗ» яшчэ да вайны. – *В. К.*) Над выпускам нумароў працавалі: былы рэдактар Любанскай раённай газеты Піліп Касцюкавец, карэспандэнт даваеннай «Советской Белоруссии» Георгій Шчарбатаў, супрацоўнікі Капаткевіцкай раённай газеты Амяльян Шурпач, Аляксандр Сакевіч, Мікалай Курыка і Ніна Цылько.

Як у артыкуле «“Чырвонка” кліча да Перамогі!» сведчыць А. Дзядзюля, «інфармацыя пра падпольную друкарню трымалася ў найвялікшым сакрэце. Першы час нават партызаны лічылі, што «Звязда» і «Чырвоная змена» дасылаюцца з Вялікай зямлі на самалёце» (Звязда, 2021, 21 крас.). Па прычыне строгай канспірацыі часта даводзілася мяняць месца дыслакацыі. Па ўспамінах супрацоўніка партызанскіх

газет А. Шурпача, умовы работы і побыту былі суровыя: «Мы не мелі права нікуды, акрамя нашых кватэр, адлучацца, нікому нічога гаварыць пра свой занятак. Нам, вядома, не спадабалася ўсё гэта. Пасля шматлікіх паходаў, небяспечных аперацый апынуцца ледзь не пад арыштам – прыемнасці мала. <…> Хутка мы пераканаліся, што суровыя ўмовы канспірацыі не выдумка, а жорсткая неабходнасць» [2, с. 120].

22 лютага 1944 года ад тыфу памёр М. Барашкаў. Пахавалі рэдактара ў вёсцы Камсамолец Старобінскага раёна (цяпер Салігорскага. – *В. К.*). У партызанскай зоне выйшла 105 нумароў «Звязды» (на тэрыторыі Любанскага раёна выдадзена 98 выпускаў) і 48 нумароў «Чырвонай змены». У сакавіку 1944 года маладзёжная газета адасобілася ад «Звязды» і пачала выдавацца ў вызваленым Гомелі, дзе яе ўзначаліў Іван Матыль (рэдагаваў да 1952 г.). Пасля вызвалення Мінска выданне беларускай моладзі, а таксама газета «Звязда» аднавілі свой выхад у сталіцы БССР. У 1965 годзе, у сувязі са святкаваннем 20-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, газета «Звязда» была ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны I ступені, у 1967 годзе найстарэйшаму выданню краіны быў уручаны ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга. Такой жа ўзнагародай да свайго 50-годдзя, у красавіку 1971 года, «за мабілізацыю моладзі на выкананне задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва» была адзначана і «Чырвоная змена».

Выдавалася на востраве Зыслаў і любанская раённая газета «Кліч Радзімы». Першы нумар органа Любанскага падпольнага райкама партыі выйшаў 9 красавіка 1943 года. У рэдакцыйны штат уваходзілі Аляксандр Сакевіч, Андрэй Луфераў, Ніна Вярынская, Рыгор Сыцько, якога прызначылі рэдактарам. Праз месяц на рэдактарскай пасадзе яго змяніў Аляксандр Сакевіч (дагэтуль удзельнічаў у выпуску падпольных «Звязды» і «Чырвонай змены»), узначальваў газету па верасень 1943 года. Трэцім рэдактарам партызанскага «Кліча Радзімы» стаў Іван Куляшоў, рэдагаваў газету да вызвалення Любанскага раёна.

У першым падпольным выпуску «Кліча Радзімы» журналісты заклікалі жыхароў Любанскага раёна далучацца да ўсеагульнай партызанскай барацьбы, на старонках газеты падводзіліся вынікі зімняй кампаніі Чырвонай арміі, расказвалася пра працоўнае жыццё савецкіх людзей у тыле. У нумары за 19 мая 1943 года газета пісала: «Свяшчэнны доўг кожнага партызана перад Радзімай з чэсцю выканаць загад правадыра. Максімальна актывізаваць баявую дзейнасць. Не даваць спакою немцам ні днём, ні ноччу, узрываць чыгункі, масты, вадакачкі…» (Кліч Радзімы, 1943, 19 мая). З успамінаў рэдактара любанскага раённага падпольнага

выдання А. Сакевіча: «У газеце змяшчаліся перадавыя артыкулы, мэтавыя падборкі, інфармацыя з франтоў і савецкага тылу, публіцыстыка, гумар. Перыядычна друкаваліся лістоўкі. Газета асвятляла баявыя подзвігі партызан раёна, паведамляла вынікі баявой дзейнасці брыгад і атрадаў, на прыкладах гераічных подзвігаў выхоўвала мужнасць, стойкасць і адвагу, адданасць Радзіме...» [3]. 22 чэрвеня 1944 года выйшаў апошні падпольны нумар. Пасля вызвалення Любанскага раёна газета «Кліч Радзімы» атрымала новую назву – «Калгаснік Любаншчыны».

У памяць аб подзвігу партызан, журналістаў, якія выдавалі падпольныя газеты, у цэнтры былой партызанскай зоны ў 1969 годзе быў узведзены мемарыяльны комплекс «Зыслаў», створаны знакамітым архітэктарам Георгіем Заборскім. Побач знаходзіцца брацкая магіла, дзе перапахаваны астанкі 290 воінаў, партызан і падпольшчыкаў, якія загінулі на тэрыторыі Любанскага раёна.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Падаляк Т. У.* Аксіялогія сучаснай беларускай журналістыкі. Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2016. 263 с.
2. Наша «Звязда», 1917–1967 гг.: зб. публіцыст.-маст. нарысаў / склад. М. Я. Філімонаў. Мінск : Беларусь, 1968. 267 с.
3. Баявы кліч. З успамінаў былога рэдактара любанскай раённай падпольнай газеты «Кліч Радзімы» А. Д. Сакевіча [Электронны рэсурс]. URL: http://lyban2009.narod.ru/Otechestvennaj_vojna/Otechestvennaj_vojna_33.htm (дата звароту: 22.04.2021).


## ОСВЕЩЕНИЕ КУЛЬТУРНОЙ ТЕМАТИКИ НА СТРАНИЦАХ «МОЛОДЕЧЕНСКОЙ ГАЗЕТЫ»


***В. А. Капцев[1], Т. А. Посох[2]***

*[1]Белорусский государственный университет,
ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,
kaptsev21@tut.by,*

*[2]Белорусский государственный университет,
ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,
posokh.04@mail.ru*



На примере «Молодеченской газеты» рассматриваются функциональные взаимоотношения региональной прессы и «культурного события» ре-